УДК 37.01(091)

*А. І. Бельскі* (Мінск)

# АКТУАЛЬНАСЦЬ ПЕДАГАГІЧНЫХ ІДЭЙ І ПОГЛЯДАЎ Ф. А. БЕЛЬСКАГА Ў КАНТЭКСЦЕ МАДЭРНІЗАЦЫІ СУЧАСНАЙ АДУКАЦЫІ

**Аннотация.** Автор статьи раскрывает суть и новаторство взглядов Ф. А. Бельского на развитие образования и воспитания в 1920-е гг. Ученый активно обращался к зарубежному педагогическому опыту, придерживался идеи дифференциации в обучении, предлагал создание отдельных школ для особо одарённых учащихся и др. Заметный его вклад в становление и организацию детского движения.

**Summary.** The author of the article reveals the nature and innovative character of F. A. Belsky's views on the development of education and upbringing in the 1920s. The famous scholar is shown as the one who actively drew upon foreign pedagogical experience, adhered to the idea of differentiation in training, suggested setting up separate schools for gifted pupils, etc. His is a noticeable contribution to the formation and organization of children's movement.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А.Кулешова

Прафесар Фама Антонавіч Бельскі (1890–1952), першы загадчык кафедры педагогікі і псіхалогіі Магілёўскага падінстытута, з'яўляецца значным вучоным першай паловы XX стагоддзя. Яго творчая спадчына працягвае актыўна вывучацца на сучасным этапе гісторыі педагагічнай навукі і адукацыі. Да прац Ф. А. Бельскага звярталіся аўтарытэтныя, вопытныя прафесіяналы ў сферы гісторыка-педагагічных ведаў (А. В. Адаменка, У. Т. Кабуш, Б. В. Пальчэўскі, М. П. Жыгалава і інш.), прадстаўнікі новага пакалення даследчыкаў, якія абаранілі кандыдацкія дысертацыі ў пачатку XXI стагоддзя (А. І. Снапкова, Т. Ю. Анпілогава, Н. Р. Асьмук, А. В. Пугач, М. А. Прынь і інш.) [9; 14]. Справядліва гаворыцца пра існаванне «феномена Бельскага» і яго ролю як вучонага-наватара ў галіне адукацыі, пачынальніка музейнай справы і краязнаўства.

Прафесар Ф. А. Бельскі аддаў вышэйшай школе больш за трыццаць гадоў, пачынаючы з 1920 года. Самым плённым і выніковым стаў яго перыяд працы ў Данецкім інстытуце народнай адукацыі (1923–1929). Менавіта ў гэтыя гады разгарнулася яго педагагічная, навукова-арганізацыйная і публікатарская дзейнасць. Ён быў адным са стваральнікаў першага педагагічнага музея пры Данецкім інстытуце народнай адукацыі (ДІНА), Навуковага таварыства на Данеччыне і інш. На працягу пяці гадоў ён надрукаваў больш як 20 педагагічных даследаванняў і работ, сярод іх асобныя выданні на ўкраінскай мове: «Педагогіка як навука (да пытання аб метадалогіі педагогікі)» (1929) і «Выяўленне арганізатараў у групе і вызначэнне арганізаванасці групы» (1928).

Працуючы ў вышэйшых навучальных установах Украіны, Расіі, Беларусі і Узбекістана, Ф. А. Бельскі не парываў і не губляў сувязі з установамі сярэдняй адукацыі. У шэрагу сваіх прац ён заклікаў да цеснай сувязі навукі і адукацыйна-выхаваўчай практыкі.

Асаблівую цікавасць уяўляюць погляды Ф. А. Бельскага на арганізацыю працы з навучэнцамі розных катэгорый у сувязі з мадэрнізацыяй адукацыі на сучасным этапе і ў кантэксце айчыннай і замежнай псіхолага-педагагічнай думкі. Першая палова 1920-х гг. у значнай ступені была спрыяльным перыядам для развіцця педагогікі і адукацыі. Замежны навуковы досвед актыўна вывучаўся і быў запатрабаваны, але паступова ўмовы змяняліся, што выявілася ў адыходзе ад плюралізму ідэй і канцэпцый, у насаджэнні новай ідэалагічнай дактрыны. Замест дыялогу і кантактаў з сусветнай педагогікай пачалася жорсткая класавая барацьба з буржуазнай педагогікай і яе ўплывам на савецкую школу. А. І. Снапкова адзначае, што зварот Ф. А. Бельскага да ідэй і работ заходнееўрапейскага вучоных «уяўляў сабой смелую навуковую і грамадзянскую пазіцыю ва ўмовах барацьбы з буржуазнай навукай і метадалогіяй» [14, с. 123]. Разам з тым нароўні з традыцыйнымі фундаментальнымі падыходамі ён імкнуўся ва ўмовах станаўлення новай адукацыйна-выхаваўчай парадыгмы выкарыстоўваць, укараняць прагрэсіўны, апрабаваны вопыт, напрацаваны ў педагагічнай тэорыі і практыцы такіх краін, як Германія, Англія, Францыя, Амерыка. Падставай для актуалізацыі, фарміравання поглядаў і наватарскіх падыходаў вучонага былі працы буйных прадстаўнікоў рускай педагогікі і адукацыі. Такім чынам, педагагічныя пошукі і погляды Ф. А. Бельскага 1920-х гг. можна разглядаць як карэляцыю або сімбіёз з педагагічнай думкай Еўропы, Амерыкі і Расіі.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Сёння пасля дзесяці гадоў мадэрнізацыі адукацыі мы зноў вяртаемся на кругі свае – да ідэі профільнай школы. Уласна кажучы, гэта нямецкая мадэль адукацыі, якая была паспяхова рэалізавана ў Расіі яшчэ на пачатку XX ст. Буйныя вучоныя-фізікі і вучоныя-гуманітарыі савецкага часу – у пераважнай большасці прадстаўнікі старой школы, інакш кажучы, выпускнікі гімназій, ліцэяў, рэальных вучылішчаў. Напэўна, сёння наша адукацыя за дзесяць гадоў магла выйсці на нейкія іншыя крэатыўныя ідэі і шляхі развіцця. Аднак на трэцяй ступені навучання зноў будзе адбываецца дыферэнцыяцыя і прафесіяналізацыя пазнавальнай дзейнасці. Сапраўды, існуе розніца паміж навучэнцамі, схільнымі да творчых спецыяльнасцей (да прыкладу, музычна адораныя дзеці), а ёсць і тыя, хто актыўна і шмат часу займаецца спортам, іншыя ўжо ў старшых класах прафесійна рыхтуюцца быць камп'ютаршчыкамі-праграмістамі, ітэешнікамі і да т. п. Безумоўна, базавага ўзроўню ў адукацыі недастаткова, Прафесар Ф. А. Бельскі выдатна разумеў, што палівaрыянтнасць, магчымасць выбару кірунку ці профілю навучання – шлях развіцця і рэалізацыі індывідуальнага патэнцыялу асобы. Стварэнне асобных школ для адораных, таленавітых дзяцей – адна з галоўных, крэатыўных ідэй у навуковай творчасці прафесара Ф. А. Бельскага. Свае погляды на вырашэнне гэтай праблемы ён выклаў у артыкулах «Арганізацыя школ для адораных дзяцей», «Арганізацыя школ для звышадораных навучэнцаў» (1927). Зыходзячы з тэарэтычных асноў дыферэнцыяцыі і індывідуалізацыі ў навучанні, ён пісаў: «Прытрымліваючыся таго погляду, што савецкая дзяржава зацікаўлена ў больш хуткім ажыццяўленні культурнай рэвалюцыі і што паскорыць рэалізацыю гэтай культурнай рэвалюцыі ў большай меры дапамогуць найбольш адораныя людзі, якія атрымліваюць ужо на школьнай лаве стымулы да развіцця сваіх асаблівых талентаў, аўтар выказвае думку аб тым, што цалкам магчымая арганізацыя такіх школ для звышадораных дзяцей. Павінна быць прадумана адпаведная методыка працы з такімі дзецьмі і падабраны найбольш прыдатныя для правядзення заняткаў з такімі дзецьмі настаўнікі» [13, с. 21]. Эліту грамадства (творчую, навуковую і г. д.) трэба рыхтаваць з ранняга ўзросту, і ў гэтым палягаў па-сапраўднаму дзяржаўны падыход вучонага ў новых грамадскіх умовах. Сам выпускнік старой школы (Слуцкай гімназіі, якую скончыў з сярэбраным медалём), ён спадзяваўся, што будзе захавана пераемнасць культурна-адукацыйных традыцый, гістарычнага вопыту. Ідэя вылучэння найбольш таленавітых вучняў у адмысловы кантынгент для навучання, стварэнне неабходных умоў для рэалізацыі іх інтэлектуальных і творчых здольнасцей грунтавалася на вывучэнні вучоным ідэй і работ І. Канта, Ф. Гальтона, В. Штэрна, А. Біне, В. Вундта, Г. Спенсэра, М. Мантэсоры, К. Д. Ушынскага, П. П. Блонскага і інш. Да педагагічных твораў замежных аўтараў Ф. А. Бельскі звяртаецца і ў іншых выпадках, пра што красамоўна сведчыць згаданая вышэй кніга «Педагогіка як навука» [7]. У артыкуле «Вывучэнне здольнасцей дзяцей» (1928) вучоны-педагог, прапануючы дыягнастычную методыку, адзначае, што трэба з ранняга ўзросту ўлічваць індывідуальныя асаблівасці і схільнасці дзіцяці, імкнуцца выяўляць і развіваць яго задаткі і здольнасці [13, с. 22]. Педагагічныя погляды Ф. А. Бельскага на вывучэнне дзіцячых здольнасцей з пункту гледжання ўзроставай псіхалогіі таксама заснаваныя на ўліку заходнееўрапейскага і расійскага навуковага вопыту. Найперш ён знаходзіўся ў дыскурсе замежнай экс-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

перыментальнай псіхалогіі і педагогікі. У працах і запісах Ф. А. Бельскага маюцца адсылкі да выданняў на замежных мовах (нямецкай і французскай), а таксама публікацый у часопісах, якія выдаваліся на пачатку XX стагоддзя і ў якіх знайшлі адлюстраванне ідэі і навацыі заходняй педагогікі: «Народное образование», «Свободное воспитание», «Вестник просвещения» і інш.

На сучасным этапе адукацыі зноў падымаецца пытанне пра эфектыўнасць тэсціравання, яго неабходнасць. Сёння выказваюцца крытычныя меркаванні адносна тэстаў па літаратуры, але ў тых выпадках, калі гэтай справай займаюцца прафесіяналы, відавочны пазітыўны вопыт. Заслугоўвае ўвагі распрацоўка Ф. А. Бельскім тэорыі і методыкі дыдактычных тэстаў у кантэксце замежнага, у прыватнасці амерыканскага, вопыту ў галіне стандартызацыі. Як адзін з эфектыўных метадаў навучання і ацэнкі паспяховасці дзяцей у засваенні вучэбнага матэрыялу прафесар Ф. Бельскі вылучыў тэсціраванне. Артыкуламі «Вымярэнне паспяховасці па стандартных тэстах», «Тэсты Корціса і спосаб іх выкарыстання» (абодва – 1926) ён закладваў тэарэтыка-метадычныя асновы ў станаўленні і развіцці тэставай сістэмы ў тагачаснай школьнай адукацыі [напрыклад, гл.: 5]. Па сваім узроўні канцэптуальнасці думкі і наватарскіх пошуках ён быў упоравень з іншымі ўкраінскімі вучонымі-дыдактамі (Р. Вашчанка, А. Залужны, А. Мандрыка, Ю. Самборс, Я. Чапіга і інш.). Прафесар Ф. Бельскі не памыляўся ў тым, што тэст з'яўляецца адным з эфектыўных метадаў дыягностыкі вучэбнай дзейнасці, ацэнкі ведаў і ўменняў. Вучоны абгрунтаваў асноўныя палажэнні стандартызаваных тэстаў, якія павінны скарыстоўвацца для выяўлення паспяховасці навучэнцаў [14, с. 19].

У дзейнасці і творчай спадчыне Ф. А. Бельскага вылучым на першы план яшчэ адзін важны аспект, які не страчвае сваёй актуальнасці па сёння. У 1920-я гг. востра паўстала пытанне сацыялізацыі дзяцей у грамадстве, наладжвання ідэйна-выхаваўчай работы з юным пакаленнем ва ўмовах новых выклікаў часу. Ф. А. Бельскі, зыходзячы з існуючых грамадска-палітычных рэалій, разумеў неабходнасць у новых формах педагагічнага ўзаемадзеяння дарослых і дзяцей, стварэння спрыяльнага выхаваўчага асяродку. Гісторык і краязнаўца Т. Ю. Анпілогава адзначае пазітыўную ролю Ф. А. Бельскага ў арганізацыі дзіцячага (піянерскага) руху на Луганшчыне і ў цэлым на Данбасе. У прыватнасці, дзякуючы архіўным крыніцам яна высветліла наступнае: «Сярод гурткоў, што дзейнічалі пры ДІНА, быў гурток дзіцячага руху, які ўзначальваў выкладчык інстытута прафесар Ф. Бельскі» [1, с. 16]. Т. Ю. Анпілогава ў шэрагу публікацый выкладае каштоўныя звесткі аб дзейнасці Ф. А. Бельскага па арганізацыі сацыяльнай і выхаваўчай працы з дзецьмі і падлеткамі, стварэнні дзіцячага (піянерскага) аб'яднальнага руху новага тыпу. Рэалізацыя такога маштабнага грамадзянска-патрыятычнага праекта мела на мэце вырашыць у першую чаргу складаную на Данбасе праблему сіроцтва, дзіцячай беспрытульнасці, бадзяжніцтва, спароджаных рэвалюцыйнымі падзеямі 1917 г. і грамадзянскай вайной [гл.: 2]. Аналагічная праблема занятасці дзяцей, іх сацыялізацыі і інтэграцыі ў грамадства мела месца ў Амерыцы і шэрагу краін Еўропы. Ф. А. Бельскі вывучаў існуючыя за мяжой канцэпцыі самаарганізацыі і выхавання дзяцей, бачыў неабходнасць выкарыстоўваць каштоўнае і карыснае з

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

гэтага вопыту ў практыцы новага руху. Прафесар праводзіў для студэнтаў тэарэтычныя і практычныя семінары па падрыхтоўцы да працы з дзецьмі і падлеткамі. Звяртае ўвагу, што ён асвятляў такія тэмы, як «Дзіцячы рух на Захадзе», асабіста распрацаваў праграму-практыкум для летняй педагагічнай практыкі студэнтаў, якія працуюць з дзіцячым кантынгентам і займаюцца яго выхаваннем [9, с. 85; 14, с. 73]. Архіў прафесара Ф. А. Бельскага, невялікая частка яго бібліятэкі, якая захавалася, а таксама шэраг работ вучонага дазваляюць вызначыць некаторыя выданні і крыніцы па замежнай педагогіцы і адукацыі, выкарыстаныя ім пры асэнсаванні ідэі развіваючага выхавання і навучання, праблемы ўзаемадзеяння школы і грамадства, сацыялізацыі асобы ва ўмовах калектыву, вывучэнні гісторыі скаўтаў і вопыту дзейнасці летніх школ (дзіцячых лагераў) у Англіі. Ён звяртаўся да прац заснавальнікаў заходняй педагагічнай думкі (Ф. Фрэбель, Д. Дзьюі, П. Наторп, М. Мантэсоры і інш.) [8; 12; 14, с. 74–75], іх прадаўжальнікаў і распаўсюднікаў перадавых дыдактычных ідэй, каштоўнага практычнага вопыту па працы з дзецьмі, стварэнні дзіцячых аб’яднанняў [10; 11]. Такім чынам, Ф. А. Бельскі, знаходзячыся ля вытокаў зараджэння і развіцця дзіцячага руху на Данбасе, закладваў у сістэмаўтваральную выхаваўчую прастору прагрэсіўныя ідэі і змястоўныя канцэпты сусветнай педагогікі. Дарэчы, адукацыйна-выхаваўчы вопыт замежнай школы быў і прадметам зацікаўленняў К. М. Бельскай, выкладчыцы нямецкай і французскай моў, педагога і жонкі прафесара [3].

Ф. А. Бельскі лічыў педагагічны эксперымент і псіхолага-педагагічнае назіранне, дыягнастычныя зрэзы і іншыя прагнастычныя, вопытныя даследаванні вызначальнымі пры вырашэнні той ці іншай праблемы, тым больш укараненні чагосьці новага. Таму актыўна вёў працу ў школьных установах, на іншых дзіцячых пляцоўках. Ён наладжваў супрацоўніцтва з навуковымі ўстановамі, педагагічнай супольнасцю. У 1921–1923 гг. Ф. А. Бельскі быў загадчыкам Златапальскай доследна-паказальнай працоўнай школы пры Інстытуце народнай адукацыі імя ІІІ Інтэрнацыянала (пазней Крэменчужскага ІНА). Затым ініцыяваў стварэнне доследнай школы пры Данецкім ІНА ў Луганску. У гэткім практыка арыентаваным кірунку сёння рухаецца і кафедра педагогікі Магілёўскага дзяржуніверсітэта імя А. А. Куляшова, якая плённа супрацоўнічае з установамі сярэдняй адукацыі рэгіёна.

Педагагічная, арганізацыйная і творчая дзейнасць прафесара Ф. А. Бельскага шматгранная, да таго ж, так ці інакш яна ў першую чаргу звязана з пошукам аптымальных метадаў, новых падыходаў у навучанні і працы з дзецьмі школьнага ўзросту. Асоба дзіцяці, якая развіваецца і сталее, была ў цэнтры ўвагі вучонага-педагога аж да апошняга этапу навукова-творчага жыцця, калі ён асэнсоўваў маральна-этычную парадыгму развіцця культуры юнага пакалення.

Ф. А. Бельскі быў уключаны ў вырашэнне актуальных, надзённых праблем: арганізацыя дзейнасці педагагічнага музея і выкарыстанне музейнай педагогікі ў працэсе навучання і выхавання [4], стварэнне тэставай дыягностыкі вучэбнай дзейнасці [5], развіццё лідарства ў школьным (дзіцячым) калектыве [6] і інш. Нават кароткі, няпоўны пералік тэм і аспектаў даследчай работы Ф. А. Бельскага сведчыць пра несумненную каштоўнасць і актуальнасць яго творчай спадчыны.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

## Літаратура


1. Анпілогова, Т. Ю. Роль інтелігенції у вихованні молоді та зародженні піонерського руху в Донбасі в 20-і роки XX ст. / Т. Ю. Анпілогова // Інтелігенція і влада: громадсько-політичний наук. зб. – Вип. 6; Сер.: Історія. – Одеса: Астропринт, 2006. – С. 13–22.
2. Анпілогова, Т. Ю. Сирітство та дитяча безпритульність на Луганщині 1920–1930-х років: причини виникнення та шляхи подолання: моногр. / Т. Ю. Анпілогова. – Луганськ: Вид-во ДЗ «ЛУ імені Тараса Шевченка», 2015. – 164 с.
3. Бельская, Е. М. Бидельская школа и использование её 35-ти летнего опыта в практике наших школ / Е. М. Бельская // Праці наукового товариства на Донеччині: зб. – Луганськ: Друк. вид-цтва «Луганська правда», 1928. – Т. 1. – С. 70–76.
4. Бельский, Ф. Педагогический музей, его организация и культурно-педагогическая деятельность / Ф. Бельский // Радянська школа. – 1926. – № 3–4. – С. 9–15.
5. Бєльський, Ф. Вимірювання успішності за стандартними тестами / Ф. Бєльський // Радянська школа. – 1926. – № 8. – С. 42–48.
6. Бєльський, Ф. Виявлення організаторів у групі та вимірювання організованості групи / Ф. Бєльський // Праці наукового товариства на Донеччині: зб. – Луганськ: Друк. вид-цтва «Луганська правда», 1928. – Т. 1. – С. 39–57.
7. Бєльський, Ф. Педагогіка як наука (до питання про методологію педагогіки) / Ф. Бєльський. – Луганськ; Донбас, 1929. – 16 с.
8. Дьюи, Д. Школа и общество / Д. Дьюи; пер. с англ. Г. А. Лучинского. – М.: Госиздат, 1924. – 175 с.
9. І прызванне, і лёс: жыццё і дзейнасць прафесара Фамы Антонавіча Бельскага / уклад. і камент. А. І. Бельскага; прадм. У. Т. Кабуша. – Мінск: Рэд. часопіса «Роднае слова», 2012. – 143 с.
10. Ландсберг, Р. Летняя работа с детьми в Англии / Р. Ландсберг; с предисл. и указателем лит., сост. Н. И. Масалитиновой. – М.: Изд. В. М. Бонч-Бруевич, 1920. – 72 с.
11. Ландсберг, Р. Распространение идей Монтессори за границей и в России / Р. Ландсберг // Вестник просвещения. – 1923. – № 10. – С. 212–218.
12. Монтессори, М. Руководство к моему методу / М. Монтессори; пер. Р. Ландсберг; под ред. И. Горбунова-Посадова. – М.: Типолитография И. Н. Кушерев и К., 1916. – 63 с.
13. Прафесар Фама Антонавіч Бельскі = Профессор Фома Антонович Бельский / уклад. А. І. Бельскі. – Мінск: Энцыклапедыкс, 2002. – 38 с.
14. Фама Антонавіч Бельскі: біяграфічныя матэрыялы і артыкулы = Фома Антонович Бельский: биографические материалы и статьи / уклад., прадм. і камент. А. І. Бельскага. – Мінск: Выдавец Зміцер Колас, 2015. – 223 с.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова